## Вучэбная дысцыпліна «Стараславянская мова»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) Дысцыпліна кампанента ўстановы адукацыі |
| **Кароткі змест** | Курс "Стараславянская мова" складаецца з чатырох самастойных раздзелаў: уводзін, фанетыкі, марфалогіі, сінтаксісу і словаўтварэння. У першым раздзеле асвятляюцца пытанні паходжання стараславянскай мовы, аўтарства і ўзнікнення славянскіх азбук. У дргім раздзеле разглядаюцца пытанні фанетыкі, фаналогіі, марфаналогіі стараславянскай мовы. У трэцім раздзеле студэнты знаёмяцца з пытаннямі марфалогіі стараславянскай мовы. Асноўная ўвага ўдзяляецца станаўленню і развіццю граматычных катэгорый часцін мовы. У апошнім, чацвёртым раздзеле разглядаюцца асаблівасці стараславянскага сінтаксісу, лексікі і словаўтварэння. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:** – гісторыю стварэння першай літаратурнай мовы славян; асноўныя помнікі стараславянскай мовы; своеасаблівасці дзвюх славянскіх азбук – кірыліцы і глаголіцы; асноўныя фанетычныя, граматычныя і лексічныя асаблівасці развіцця мовы ад індаеўрапейскай да праславянскай і далей да стараславянскага стану; будову фанетычнай, граматычнай і лексічнай сістэмы стараславянскай мовы;<br>Студэнт павінен **умець:** – чытаць, перакладаць і аналізаваць тэксты на стараславянскай мове; – прымяняць атрыманыя веды пры вывучэнні сучасных славянскіх моў; – прымяняць атрыманыя веды пры вывучэнні гісторыі і дыялекталогіі славянскіх моў.<br>Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне кампетэнцыі<br>СК-9 – аналізаваць старажытнаславянскія моўныя змены на аснове параўнальна-гістарычнага метаду. |
| **Прэрэквізіты** | Сучасная беларуская мова, беларуская палеаграфія |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне – 108 (3 заліковыя адзінкі). Колькасць аўдыторных гадзін – 60, з іх лекцыйных – 30, практычных – 30. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 5 семестр, тэставыя заданні, залік. |